Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№98(611) 25 мая 1993 г. Аўторак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 618816 экз. Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Вкратце

В Минске завершились трехдневные переговоры экспертов министерств обороны Беларуси и США по вопросам сотрудничества на основе американского закона Нана—Лугара.

Одним из подписанных в ходе встреч соглашений предусматривается в ближайшее время поставка американской стороной спецоборудования для кабинета ускоренного усвоения белорусскими военными английского языка.

❑

Международный семинар по проблемам профсоюзного движения прошел в Минске.

Участники встречи из Польши, Словакии, Литвы, Беларуси, Украины, Китая были единодушны во мнении, что пришла пора создания международного профсоюзного объединения на принципиально новых условиях.

❑

Группа французских промышленников, занимающихся вопросами конверсии, посетила Минск.

Итогом визита должен стать справочник с адресами белорусских предприятий и институтов, который будет издан в Париже.

❑

Договор о торгово-экономическом сотрудничестве подписан между Могилевской областью и Кашкадарьинской областью Узбекистана.

Договором предусмотрен обмен материально-сырьевыми ресурсами, промышленной продукцией и прогрессивными технологиями, товарами народного потребления и продуктами питания.

❑

В Бресте завершил работу первый съезд социал-гигиенистов и организаторов охраны здоровья Беларуси.

Делегаты обсудили проблемы реформирования службы охраны здоровья и создания собственной системы медицинского обслуживания населения, пути выхода из нынешнего тяжелого положения.

❑

По 26 мая в гостинице "Юность" под Минском будет проходить международная конференция "Проблемы и перспективы трудоустройства инвалидов по зрению в условиях рыночной экономики: трудоустройство для большинства, социальная защищенность для всех".

В конференции принимают участие делегации обществ слепых из государств ближнего и дальнего зарубежья — Украины, Литвы, Греции, Италии, Германии.

Моссовет обозвали дурдомом

Это случилось вчера на внеочередной сессии Моссовета.

Коммунистическое большинство депутатского корпуса превратило сессию в скандальный митинг. Благо, нашелся подходящий случай: обсуждалось представление городской прокуратуры о даче согласия на возбуждение административного дела против одного из организаторов первомайских беспорядков в Москве Виктора Анпилова.

Сначала был отстранен от ведения сессии председатель Моссовета Н.Гончар. Затем в зал впустили пикетчиков с улицы, которые и задали тон "депутатской деловитости".

Сессию-митинг, не решившую ни одного конкретного вопроса, один из депутатов назвал дурдомом.

Леонид ФАДЕЕВ.

Вы чьи будете?

Вчера в Севастополе андреевские флаги подняли еще 29 кораблей Черноморского флота.

Теперь число судов под русскими флагами достигло 115 единиц. Между тем Председатель Верховного Совета Крыма и представитель президента Украины в Севастополе запретили церковное освящение андреевских флагов на кораблях.

Радио "Свобода".

Колеса диктуют вагонные...

Дирекция полоцкого вокзала решила построить еще один дополнительный путь для приема и отправки пассажирских поездов.

Это решение связано с тем, что за последнее время на западном направлении, в частности на Польшу и Латвию, были открыты новые маршруты, которые значительно увеличили поток составов.

Игорь ЛЕОНИДОВ.

Рисунок Олега ПОПОВА.

Спорт-экспресс

Состоялась жеребьевка, определившая состав отборочных групп к мужскому и женскому чемпионатам мира по волейболу, которые состоятся в 1994 году.

У мужчин чемпионат пройдет без белорусов. Наши волейболистки будут играть в одной группе с командами Болгарии, Канады и Азербайджана.

❑

В Раубичах состоялась презентация белорусской национальной олимпийской команды по биатлону.

Лучшими биатлонистами года признаны Светлана Парамыгина и Александр Попов.

❑

Победой российских спортсменок завершился в румынской столице чемпионат Европы среди юниоров по ритмической гимнастике. У наших спортсменок — четвертое место.

XV Менделеевский: что еще нахимичим?

Вчера в столичном кинотеатре "Октябрь" начал работу очередной Менделеевский съезд по общей и прикладной химии. Делегации более 20 стран ближнего и дальнего зарубежья собрались на этот традиционный и очень представительный форум. В его открытии принял участие Председатель Верховного Совета Республики Беларусь Станислав Шушкевич.

В программе съезда, который продлится почти неделю, — пленарные и секционные заседания, "круглые столы", открытые дискуссии, выставка "Экозим"... Светила мировой науки должны определиться, по какому пути будет развиваться химическая отрасль, как уберечь от ее вторжения человека и окружающую среду.

Виктор ЗАГРАДСКИЙ.

Пофестивалим?!

Флаги четырнадцати стран мира и полет марионеточного Буратино под куполом Государственного театра кукол Беларуси возвестили об открытии в белорусской столице второго международного фестиваля кукольных театров.

Спектакли, которые покоряли сердца театралов во многих странах мира, теперь посчастливилось посмотреть и белорусским зрителям.

Организаторами фестиваля стали Министерство культуры Беларуси, Союз театральных деятелей, Мингорисполком и Государственный театр кукол Беларуси.

Екатерина ВЫСОЦКАЯ.

Все идет по плану

Семь фирм из Германии, Норвегии, Италии, Испании и США представили свои проекты реконструкции Мозырского нефтеперерабатывающего завода.

Кто победит в конкурсе — решит специальная комиссия. В задачу же реконструкции входит получение технологий, отвечающих мировым стандартам.

Анатолий ГОТОВЧИЦ.

Жуткая находка

Кисть руки была обнаружена в отстое очистных сооружений в поселке Тарный близ Витебска.

В результате расследования установлено, что пораженную гангреной кисть у гражданки Н. ампутировали медики...

Андрей ВИКОЛЬСКИЙ.

Ветры и солнце для сосен

Строительство энергополигона, призванного с помощью нетрадиционных для Беларуси источников энергии удовлетворить потребность в электричестве местных предприятий, предусматривается в поселке Сосны под Минском.

Соответствующий проект, созданный учеными Минска, Москвы, Харькова и ряда других городов бывшего Союза, находится сейчас на рассмотрении в Совете Министров республики.

Алесь АНДРОСОВ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

Анонс

Вернуть народу его главное духовное достояние — страницы подлинной истории!

Завтра мы начинаем публиковать очень важный материал. Без него не обойдется ни один школьник, студент, преподаватель, никто из нас. Он может и должен стать нашей главной настольной книгой. Речь идет о работе "100 вопросов и ответов из истории Беларуси", которую подготовили 36 известных исследователей нашей страны.

Что мы знаем о своей Родине? К сожалению, практически ничего. О ней куда больше осведомлены на Западе. Недобрые люди отобрали у нашего народа его историческую память, завещания предков, вместо этого подсунули свои мифы и выдумки. Зачем? С какой целью? На эти и многие другие волнующие вопросы читатели найдут ответы в названной публикации.

Сегодня мы возвращаем нашему народу его главное духовное достояние — страницы подлинной истории, имена его великих сынов, которыми по праву гордится Европа, их завещания нам. Читайте, набирайтесь сил и мудрости, которые идут из глубины веков. В них — наше прозрение и спасение.

Дыпламатычны кур'ер

Да візіту Яна Эліясана ў Беларусь

25—28 мая адбудзецца візіт у Рэспубліку Беларусь намесніка Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, спецкаардынатара ААН па Чарнобылю Яна Эліясана.

Ян Эліясан нарадзіўся 17 верасня 1940 года ў Гётэбаргу (Швецыя). У 1965 годзе атрымаў ступень магістра гуманітарных навук на факультэце эканомікі Гётэбаргскага універсітэта.

Дыпламатычную службу пачаў у 1965 годзе, займаў розныя пасады ў Міністэрстве замежных спраў Швецыі. У 1980 годзе ўзначаліў шведскае ўпраўленне сувязі ў Солсберы ў Радэзіі (цяпер Зімбабве). Ён таксама быў першым сакратаром пасольства Швецыі ў Вашынгтоне (1970—1974 гг.) і другім сакратаром пасольства Швецыі ў Боне (1967—1970 гг.). З'яўляўся членам дэлегацыі Швецыі ў Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) у Парыжы ў 1967 годзе.

Пан Эліясан служыў дыпламатычным саветнікам у адміністрацыі прэм'ер-міністра (1982—1983 гг.), намеснікам міністра па палітычных пытаннях міністэрства замежных спраў у Стакгольме (1983—1987 гг.).

На працягу гэтага ж перыяду быў сакратаром Кансультатыўнага савета Швецыі па пытаннях знешняй палітыкі, а таксама экспертам абароннай камісіі Каралеўства Швецыі.

З сакавіка 1988 года быў назначаны пастаянным прадстаўніком Швецыі пры ААН. Адначасова, аж да 1991 года, з'яўляўся асабістым прадстаўніком Генеральнага сакратара ААН па пытаннях увасаблення ў жыццё рэзалюцыі Савета Бяспекі, звязанай з ірана-іракскімі праблемамі. Акрамя таго, быў таксама старшынёй мэтавага фонду ААН для Паўднёвай Афрыкі (1988 г.), старшынёй рабочай групы Генеральнай Асамблеі па змякчэнню надзвычайных сітуацый (1991 г.), віцэ-прэзідэнтам Эканамічнага і Сацыяльнага савета (1991—1992 гг.).

У лютым 1993 года Генеральны сакратар ААН Бутрас Галі назначыў Яна Эліясана каардынатарам па аказанню дапамогі ў выпадку стыхійных бедстваў на ўзроўні намесніка Генеральнага сакратара ААН. Ён таксама з'ўляецца дырэктарам савета наступных арганізацый: Інстытута даследаванняў пытання бяспекі паміж Усходам і Захадам (Нью-Йорк), Міжнароднай акадэміі міру і міжнароднай асацыяцыі пастаянных прадстаўнікоў пры ААН, а таксама прадстаўніком Швецыі ў апараце вырашэння канфліктаў канферэнцыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Жанаты, мае дзвюх дачок і сына.

Аддзел інфармацыі МЗС Рэспублікі Беларусь — Белінфарм.

Чаму я пачынаю дзень з "Народнай газеты"?

Паважаная газета!

Нездарма ты завешся "Народнай". Нейкі час я прыглядалася: ці адпавядае назва зместу? Зараз цвёрда магу сказаць — адпавядае.

Газета народная па духу, па наяўнасці двухмоўя. Мае свой лёс, свой гонар, свой твар і свой авангард няўрымслівых і неабыякавых журналістаў. Не ведаючы іх асабіста, лічу іх сваімі добразычліўцамі і аднадумцамі.

З цікавасцю чытаю асэнсаванні сучасных палітычных калізій Паўлам Якубовічам; разважлівыя і грунтоўныя артыкулы Івана Макаловіча; вострыя, як лязо, Івана Герасюка; цеплынёй кранаюць сэрца трапяткія словы Ліліі Ламсадзе, яе боль за неўладкаваныя чалавечыя лёсы; прарэджвае частакол жыццёвых пытанняў Юрый Наяровіч. А калі-нікалі, у крытычныя моманты, грукне, як цяжкая артылерыя, галоўны рэдактар Іосіф Сярэдзіч.

Палярныя пункты гледжання, якія друкуюцца ў газеце без каментарыяў, вучаць разважаць, разбірацца ў складаных сітуацыях, звяраць свае думкі з думкамі апанентаў і ў выніку займаць слушную пазіцыю.

Будзь здарова, паважаная газета, і ніколі не хварэй на хістанні ні ўправа, ні ўлева. Ідзі прама, як ідзе большасць майго народа. Нездарма ж ты носіш яго высокае імя.

Твая пастаянная чытачка

Ала ВАНЬКЕВІЧ.

г. Мінск.

Актуально

Нерядовые случаи

Как проходит нынешний призыв в армию? Сколько возбуждено уголовных дел на тех, кто отказывается надевать военную форму? На эти и другие вопросы отвечает заместитель начальника следственного управления прокуратуры Минска Борис Легчин.

— Понятно, что вам в основном приходится сталкиваться с теми, кто старается обходить призывные пункты, что называется, за километр. Поэтому первый вопрос: какие меры к уклонистам применяются?

— Зачастую все-таки удается решать возникающие конфликты, не доводя их до суда. Хотя не с каждым удается найти взаимопонимание. Вынуждены и вызывать их в прокуратуру для бесед, и отправлять письма родителям, и проводить рейды, чтобы отыскать скрывающихся будущих новобранцев. Привлекаем к этой работе и участковых. А если ничего не помогает, только тогда возбуждаем уголовные дела. За минувший и этот годы набралось двадцать таких дел.

— Чем они закончились?

— Осуждены пять человек на срок от года до двух. Часть дел приостановлена, другая — находится в работе у следователей. Хочу сказать, что подобные меры сыграли определенную роль. Около пятисот ребят одумались и явились на призывные пункты, хотя прежде игнорировали все приглашения.

— Сейчас много нареканий на работу военкоматов. В частности, их критикуют за то, что они действуют скорее, как своеобразный конвейер, не стремясь порой даже попытаться понять проблемы будущих солдат...

— К сожалению, упущения есть у всех. Нередко мы сталкиваемся с тем, что военкоматы отправляют в прокуратуру материалы, не узнав точно о причинах, по которым иные не приходят на те же медкомиссии. Заводской военкомат столицы, например, ставит вопрос о привлечении к уголовной ответственности, проводим проверку и выясняется — парень в день призыва находился в больнице или вообще не пригоден к службе. На днях, кстати, на координационном совете правоохранительных органов Минска с участием военкоматов рассматривались проблемы нынешнего призыва, в частности и наши совместные недоработки...

— Что, на ваш взгляд, еще мешает нормальному призыву в армию?

— Несовершенство законодательства. В нем есть немало лазеек, при помощи которых можно отмахиваться от службы, и даже суд будет бессилен что-либо сделать.

Голас народа

У рабочых і ў прадпрымальнікаў супрацьлеглыя погляды на прыватызацыю. Настаўнікі і ўрачы прапануюць усё падзяліць пароўну

У перыяд з 18 па 20 мая 1993 года беларуская служба "Грамадская думка" правяла па заказу "Народнай газеты" апытанне насельніцтва рэспублікі. У ходзе апытання былі вывучаны меркаванні аб варыянтах прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці 1000 чалавек з усіх абласцей Беларусі. Кожная з названых у табліцы сацыяльна-прафесійных груп прадстаўлена роўнай колькасцю рэспандэнтаў.

Варыянт прыватызацыі	Сацыяльна-прафесійныя групы (у % да колькасці апытаных): Працаўнікі прамысловых прадпрыемстваў	Работнікі сферы абслугоўвання	Супрацоўнікі бюджэтных арганізацый	Працаўнікі сельскай гаспадаркі	Упраўленцы	Прадпрымальнікі	У цэлым сярод апытаных
1. Права на долю дзяржаўнай уласнасці (прыватызацыйны чэк, ваўчар) павінен атрымаць кожны грамадзянін Беларусі	36,0	24,0	70,0	50,0	61,0	46,0	48,0
2. Пераважнае права на прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці павінны атрымаць працоўныя калектывы прадпрыемстваў	54,0	54,0	14,0	30,0	20,0	0	29,0
3. Дзяржаўная ўласнасць павінна прыватызавацца шляхам выкупу без усялякіх абмежаванняў усімі, у каго ёсць сродкі	6,0	6,0	6,0	6,0	14,0	46,0	14,0
4. Не ведаю, што адказаць	4,0	16,0	10,0	14,0	4,0	8,0	9,0

Беларуская служба "Грамадская думка".

Ало, вас слухае "Народная газета"

"Вы ўсё яшчэ ў палоне ўчарашняга дня..."

Іван МАКАЛОВІЧ

Мы жывём у краіне, у якой вельмі шмат гавораць. Але поспеху дабіваюцца там, дзе ўмеюць слухаць і думаць. Таму давайце пачытаем гэтыя радкі пра набалелае і сур'ёзна падумаем. Зазначу толькі, што "па гарачым тэлефоне" ў мінулую пятніцу пазваніў 41 чалавек...

— Ало, "Народная"?.. Гаворыць **Мікалай Паўлавіч Цюркін**. Абавязкова напішыце вось аб чым. Наша фірма знаходзіцца на вуліцы Маркса. Адсюль усе беды. Заходнія партнёры неахвотна ідуць на кантакты. Пытаем: у чым справа? А яны адкрытым тэкстам: "Хто з вамі будзе мець справу, калі вы ўсё яшчэ працуеце на вуліцы Маркса, а жывяце на вуліцы Леніна? Адзін гэты штрых сведчыць: вы ўсё яшчэ ў палоне ўчарашняга дня і нават не здольны зразумець гэта. Спачатку, як кажуць, праветрыце свае мазгі, а потым пачынайце ўжо выходзіць у Еўропу".

— Як вы думаеце, чаму хто-ніхто з высокага начальства пішчом лезе ў ваенны саюз? — чуецца чарговы голас у трубцы. — Калі нехта яго пакрытыкуе альбо выкрые высокага злодзея, тады яны пашлюць яго сына ў "гарачую кропку". І кожны ўпадзе перад высокім чыноўнікам на калені і стане прасіць... Сумленныя людзі вымушаны будуць плаціць за праўду жыццямі сваіх дзяцей. Заўважце, знешне ўсё прыстойна, гавары што хочаш, дэмакратыя... Ім, я думаю, вельмі патрэбны "гарачыя кропкі", каб уціхамірваць народ.

— Ваша прозвішча?

— А навошта? Хіба няпраўду кажу?

Чарговы званок.

— Турбуе вас **Мікалай Пятровіч Кара** з Глускага раёна. Летась далі нам дадаткова па гектару зямлі. Мы пасеялі азімыя. Сёлета іх перааралі. Старшыня калгаса імя Кірава не дае зямлі нават пад бульбу. Куды нам звяртацца? У раёне праўды не дабіцца...

Такі ж званок і з Фаніпаля ад **Уладзіміра Жука**. У мінулым годзе дабавілі зямлі. Цяпер старшыня калгаса адабраў яе. Што хоча, тое і робіць.

Людміла Сямёнаўна Малішэўская, пенсіянерка з Лоева:

— У нас аўтобус назвалі таксі. І сталі браць шмат грошай за паездкі. У тым ліку і з пенсіянераў, якія маюць ільготы.

Віктар Фёдаравіч Ланец, падпалкоўнік запасу:

— Здзівіла інтэрв'ю расійскага пасла Сапрыкіна. Ён раіць, якія падзеі нам адзначаць, а якія не. Яму, бачыце, не падабаецца перамога пад Оршай. А нам не падабаецца Сувораў, які пакінуў на Беларусі крывавы след. Няхай яны адмовяцца тады адзначаць яго юбілеі.

Мікалай Пятровіч Засінец з Гомеля раіць: "Завядзіце рубрыку "Сумленне кіраўніка". Адсюль усё ідзе".

Тамара Сцяпанаўна Цапава:

— Чатыры разы чытала вашы артыкулы "О, як далёка нам яшчэ да Беларусі!" З алоўкам. Іх бы выдаць асобнай брашурай... (Амаль кожны цёпла ўспамінаў прыгаданыя артыкулы. Дзякуй ім усім.)

Уладзімір Давідоўскі, слесар трактарнага завода:

— Калі б я быў кіраўніком урада, даўно прыслухаўся б да апазіцыі. Адтуль можна пачуць разумныя рашэнні.

Жанчына, якая не назвала сваё прозвішча:

— Дачка атрымала падручнікі. Бацюхны! Там усё пра Леніна і сацыялізм, пра гісторыю Расіі. А дзе ж пра Беларусь? Аб чым думаюць у Міністэрстве адукацыі?

Уладзімір Рыгоравіч Шыдлоўскі, урач з Мінскага раёна:

— Ганьба для ўсёй рэспублікі, калі будзе ўведзена двухмоўе.

У падтрымку беларускай мовы выказаліся **Пётр Яўменавіч Бухцееў** са Слоніма, **Надзея Восіпаўна Арлоўская** і іншыя.

Віталь Мікалаевіч Ларыёнаў, слесар завода аўтаматычных ліній:

— Некаторыя бачаць толькі беларускі нацыяналізм, якога не існуе, і ўпарта не заўважаюць расійскі, які аж выпірае. Нібыта мы навязваем Расіі сваю мову, гісторыю, ваенны саюз, а не наадварот. Асабліва стараюцца ў гэтым плане саўмінаўскія газеты.

Міхаіл Мікалаевіч Рудкоўскі з Калінкавіч:

— Час вярнуць чырвоны сцяг. Навошта мянялі? Як вы лічыце?

— Я лічу, што Радзіму і яе сцяг, як і бацькоў, не выбіраюць і не мяняюць, а прымаюць як спадчыну.

Ларыса Іванаўна Куневіч:

— Мне шкада многіх дэпутатаў-ветэранаў. Як ім дапамагчы зразумець, што адбываецца ў жыцці?

Востра крытыкавалі работу парламента і іншыя абаненты. Чытач **Урбановіч** упэўнены, што значная частка дэпутатаў адарвалася ад жыцця. Такой думкі прытрымліваецца і пенсіянер **Вадзім Кіслякоў**. **Мікалай Рымараў**, ветэран працы з Мінска, зазначае, што яго абурае пазіцыя тых парламентарыяў, якія галасуюць за ўваходжанне ў ваенны саюз. Усім, хто хоча мець зямлю, трэба даць, і жыццё палепшае...

У заключэнне ён дадаў:

— А вы, "Народная...", трымайцеся! І далей не бойцеся гаварыць праўду...

❑

Званкі працягваліся і пасля абеду, і калі рыхтавалася да друку гэта справаздача. Слухаючы людзей, міжволі прыходзіш да думкі: а чаму б не прыслухацца і ўраду, і парламенту да голасу народа?

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Репортер узнал

Послы районного праздника

На празднование 200-летия Калинкович приехали послы России и Японии в Беларуси.

Яркий праздник с участием звезд белорусской эстрады, фольклорных коллективов начался на центральной площади города и был продолжен в городском парке и на стадионе.

Анатолий ИВАНОВ.

Не нужен нам "Ройял" голландский!..

Завод агрофирмы-колхоза "Рогозненский" Жабинковского района возобновил производство спирта-сырца.

Предприятие, спасибо Егору Кузьмичу, было законсервировано 8 лет назад, когда развернулась битва перестройки с "зеленым змием". "Змий" не в пример другой стороне оказался ничего себе, крепеньким.

...А людям приятно

Впервые подобные гулянья состоялись четыре года назад, причем та круглая дата города отмечалась, помнится, в сентябре.

Нынешний, 974-й день рождения Бреста — с парашютистами, танцами, фейерверком и группой "На-на" — исполком назначил на теплый май, решив, что городу без разницы, а людям приятно. Расчет оправдался, и получился чудный праздник, каких осталось в нашей жизни не так много.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Гнется фермер, но не ломится

Витебское облсельхозуправление обнародовало данные о развитии фермерских хозяйств по итогам прошлого года.

За это время их число удвоилось, достигнув 670. Средняя урожайность посевов у "единоличников" пока ниже, чем в колхозах-совхозах. Это и понятно: более трети фермеров не имеют тракторов, лишь десятая часть обзавелась комбайнами, менее трети смогли использовать минеральные удобрения. Зато надои у крестьянских коров на 28% выше, чем в среднем по области.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Гоморра и Содом?

Семи жителям Витебска, официально зарегистрированным как носители вируса СПИД, в ближайшее время, может, прибавится "новобранцев" этой смертельной хвори. Свидетельство тому — устрашающий рост венерических заболеваний.

За первый квартал сифилитиков стало больше в полтора раза, а число больных гонореей почти удвоилось по сравнению с таким же периодом прошлого года. Как правило, это совсем молодые люди, часто 14—16-летние. Одна любвеобильная юная девица ухитрилась в течение нескольких дней заразить около 3 десятков случайных партнеров.

Сергей БЕЛЫЙ.

Работа у них такая?

Не успели в Витебске утихнуть разговоры о заказном убийстве молодой женщины, которое совершил санитар морга 3-й городской больницы, как следствие по очередному "мокрому делу" снова привело в морг, на сей раз — областной клиники.

Временный приют умерших стал чем-то вроде явочной квартиры для преступной группы, между прочим, промышлявшей раскопками старых "стволов" на полях войны. Работник морга и его сообщники арестованы в связи с убийством одного человека и ранением другого. В обоих случаях было применено огнестрельное оружие.

Степан СТАРОЖИЛ.

С песней по жизни. И после

Самые печальные мелодии бардов звучали в день похорон их друга, известного в республике витебского исполнителя собственных песен 27-летнего Александра Лопатина.

Он погиб под колесами автомобиля, похищенного группой подгулявших юнцов и с нарушением правил мчавшегося по улице.

Деньги для близких Лопатина в связи с трагедией его коллеги по самодеятельному творчеству собрали на площади Свободы исполнением песен, слушая которые жители города вносили пожертвования.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Наваселле ў "польскім доме"

У новы будынак на рагу вуліц 17 верасня і Дзяржынскага ў Гродне пераехаў Саюз палякаў Беларусі. Акрамя гэтай грамадскай арганізацыі, тут адзначыла наваселле польская газета "Глос з-над Нёмна".

Арыгінальны, з розналякаровай цэглы, з мансардай і пад чарапічным дахам будынак узведзены за кароткі тэрмін на сродкі польскіх грамадскіх арганізацый фірмай "Аркада" з Беластока і сумесным беларуска-польскім прадпрыемствам "Палоня".

Хутка ў горадзе на Нёмане пачнецца будаўніцтва польскага культурна-асветнага цэнтра з тэатрам, школай, бібліятэкай і іншымі установамі, праект якога распрацавалі беларускія архітэктары. Размесціцца цэнтр на левым беразе Нёмана, насупраць Новага замка.

У перспектыве польскія культурна-асветныя цэнтры пачнуць дзейнічаць таксама ў Баранавічах, Лідзе, Пастаўах і Шчучыне.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ,
Белінфарм.

г. Гродна.

У Латвію без візы, але з пуцёўкай...

Палітычным актам назвалі пасол Латвійскай Рэспублікі ў Беларусі Яніс Лоўнікс і дзяржаўны сакратар па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў Уладзімір Заламай падпісанае імі пагадненне аб вяртанні санаторыя "Беларусь" на Рыжскім узмор'і ва ўласнасць нашай рэспублікі.

Пасля падпісання дакументаў Яніс Лоўнікс адказваў на пытанні журналістаў, адзначыўшы, што Урад Латвійскай Рэспублікі вітае вяртанне ўласнасці яе сапраўднаму гаспадару. А той факт, што санаторый нейкі час належаў Латвіі, тлумачыцца палітычнай сітуацыяй, якая ўзнікла ў суме для краіны час. Калі ў Латвіі бясчынстваў АМОН, вылезлі наверх усе крымінальныя элементы, мы павінны былі ратаваць маёмасць. І Саўмін рэспублікі ўзяў пад сваю ахову не толькі беларускія і расійскія санаторыі і дамы адпачынку, але і ўсю маёмасць дзяржаў былога Савецкага Саюза. Але Латвія ніколі не ставіла перад сабой мэту захопу чужой маёмасці, таму сённяшняя падзея — заканамерны працэс.

Яніс Лоўнікс таксама заявіў, што з сённяшняга дня для некаторых грамадзян Беларусі будзе адменены візавы рэжым. Урад Латвійскай Рэспублікі прыняў рашэнне, што з гэтага часу любы грамадзянін Беларусі, які мае законна набытую пуцёўку для адпачынку ў гэты санаторый, можа атрымаць візу ў латвійскім пасольстве бясплатна. Гэта, паводле слоў дыпламата, не проста прыгожы жэст, а рэальная дапамога беларусам, якія перажываюць вынікі чарнобыльскай катастрофы.

Аляксандр ЛЮШКЕВІЧ,
Белінфарм.

Мінск.

"Вайна сусветаў" у аграрный ВНУ

Як НЛА, нечакана з'явілася на студэнцкім фестывалі, які праходзіў у Віцебску, тэатральная студыя арыгінальнага жанру "Лаштаноіды".

Нідзе раней не "запеленгаваная" група акцёраў з Беларускага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта выклікала ў гледачоў з-над Заходняй Дзвіны сапраўдны фурор.

Прадстаўленая імі праграма "Адваротны бок грані" была прызнана лепшай, студыя заняла першае месца, абагнаўшы вядомых майстроў сцэны.

Атрымаўшы запрашэнне на "Славянскі кірмаш", студыя рыхтуе для яго новы спектакль — "Вайна сусветаў". Па задуме гэта будзе нешта суперфантастычнае. Што ж, пачакаем прэм'еры.

Віктар КУКЛОЎ,
Белінфарм.

Мінск.

Есть идея!

"До войны проблем с топливом на селе не было,

• потому что на каждом тракторе стояла газогенераторная установка, работающая на отходах древесины..."

Павел СТАСЕВИЧ

Ничто так не разрушает народы, как незаработанное богатство и бездумная бедность, жирующая на транжирстве дарованных природой богатств.

Бывшая Страна Советов разбазаривала, без преувеличения, хронически, [illegible] леса, реки, золото, металл, нефть, газ.

А сейчас вдруг все "республики-сестры" опомнились и начали нервно дергать плечами — всюду жмет. Особенно — по части энергетической: нет бензина-солярки ни в городе, ни на селе.

Плюнув на мытарства с заправкой своего "Жигуля", я поставил его "на прикол" и решил [illegible]

[illegible]

[illegible] старожилы.

— И начали загибать пальцы: мельницы водяные и ветряные, какие-то "динамо-машины", "конская тяга" и т.д.

— А чего-нибудь ближе к нашему моменту нет? [illegible]

Старики морщились да обещали еще подумать и сообщить попозже.

Но на помощь и зверь бежит.

Художник Анатолий Александрович Наливаев позвонил и рассказал [illegible]

А сама суть дела, [illegible], такова.

— Очень жаль, — сказал Анатолий Александрович, — что у нас все всего хотят больше, но мало думают, как обойтись меньшим.

Я вот до войны работал на тракторе. И никаких проблем с топливом, помню, не возникало. А все потому, что на каждом тракторе и даже машинах-полуторках, ЗИС-5 стояли газогенераторные установки, работавшие на обыкновенных чурках. [illegible]

[illegible]

[illegible] Допускаю. Но, по-моему, лучше вспомнить хорошо забытое старое и постараться его обновить, чем ходить с протянутой рукой по кругу.

А на селе даже сейчас, уверен, эта установка ценности не потеряла: и для фермера сгодится, и для колхоза. [illegible]

Так что передайте мой совет-просьбу ученым и изобретателям-умельцам: пусть поищут где в архивах да найдут ту газогенераторную установку и осовременят (если, конечно, не затянут дело на десятилетия). Уверен, польза будет. [illegible]

Вот такое предложение поступило на днях в нашу "Энергетическую копилку" [illegible]

Ждем и новых мыслей [illegible] Пишите, звоните (тел. 29-60-42).

Ад рэдакцыі.

Дзіўныя рэчы адбываюцца — раптам пошта прыносіць ліст народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь В.Сарокіна, у якім ультыматум-пратэст: калі не надрукуеце маё пісьмо, якое я даўным-даўно перадаў праз Сакратарыят Вярхоўнага Савета, буду ставіць пытанне на чарговай сесіі. Наводзім даведкі, і аказваецца, што рэдакцыя ніякага ліста В.Сарокіна ў апошні год не атрымлівала.

Дамовіліся: аўтар дасылае копію і мы, пацвярджаючы прыхільнасць плюралістычным прынцыпам, друкуем яго на старонках газеты. І тут у рэдакцыю заходзіць яшчэ адзін народны дэпутат Рэспублікі Беларусь, А.Трусаў, які з парога працягвае ўлётку, распаўсюджваемую па Мінску, за подпісам Валянціна Корзуна, дарэчы па прафесіі не гісторыка, але прэтэндуючага на роль спецыяліста ў гэтай галіне. А заадно — адказ яму загадчыка аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі А.Літвіна. Мяркуем, ліст апошняга з'яўляецца адказам і на развагі В.Сарокіна, а таксама многім іншым, хто сумняваецца ў гістарычнасці сённяшняй нацыянальнай сімволікі.

Лісты друкуюцца на мове арыгіналаў.

Хочу ответить

Я сказал правду...

Валентин СОРОКИН,
народный депутат Республики Беларусь

Во время моего выступления 28 октября прошлого года на сессии Верховного Совета Республики Беларусь я коснулся государственной символики и сказал следующее: "Ведь флаг профашистского марионеточного государства (Белорусской Центральной Рады) не украшает лицо современной Беларуси".

Вскоре я получил много писем-откликов на это выступление, в том числе и читателей "Народной газеты", которые обратились с просьбой разъяснить мою позицию в этом вопросе. Из писем я понял, что по непонятным причинам население Беларуси дезинформировано об истинной истории этого флага.

Большинство авторов меня поддержали: "Вы сказали правду, а с каких это пор у нас правда стала оскорблением?" Житель города Гродно Бурштейн Л.Л. выразил свою мысль более откровенно: "...под бело-красно-белым знаменем осуществляли карательные акции против мирных жителей и партизан опекаемые немецко-фашистскими оккупантами предатели белорусского народа. Звери в человечьем облике мучили и убивали простых, ни в чем не повинных женщин, стариков и детей. Подобные им изверги в период наведения гитлеровцами "нового порядка" убили моих родителей..."

Другим мои слова о флаге пришлись не по вкусу. Автор одного письма даже написал, что для меня история с бело-красно-белым флагом началась с 1917 года, явно намекая на более раннюю историю этого флага. Должен его разочаровать. История бело-красно-белого флага начала свой отсчет именно в это время, а точнее, в 1918 году, когда Рада так называемой Белорусской Народной Республики приняла этот флаг. Сохранилось его описание активным деятелем Рады Т.Грибом, согласно которому флаг был разносторонний, на манер старинных средневековых штандартов: на одной из сторон он имел изображение знака "Погоня" в лучах солнца, на другой — бело-красно-белые полосы (Іскры Скарыны. Прага, 1935 г., №5).

И уж если быть до конца искренним, то следует рассказать народу Беларуси и о том, что у истоков государственности Белоруссии в конце 1917 года на всебелорусском конгрессе, который проходил в Минске, "...дэлегаты між іншым абмеркавалі і праект беларускага сцяга, узор якога быў прывезены адным з дэлегатаў. На сцягу меркаваліся тры паласы — чырвоная, белая і блакітная — па колеру беларускіх рэчак і азёр (Я.Дыма. Праз гады барацьбы і выпрабаванняў. "Крыніца", 1989 г.).

Возвращаясь к бело-красно-белому флагу, надо еще раз сказать, что наш государственный флаг значительно отличается от флага БНР, зато полностью копирует флаг марионеточного профашистского "государства" спадара Р.Островского, образованного в 1943 году по указу генерального комиссара генерального округа Белоруссии группенфюрера СС фон Готтберга. Этот флаг был утвержден в качестве национального для белорусов предыдущим генеральным комиссаром оккупированной Беларуси, одним из главных палачей белорусского народа В.Кубэ 27 июля 1942 года.

То ли по злой иронии судьбы, то ли по умыслу, но день 27 июля сегодня провозглашен национальным праздником Республики Беларусь.

Таковы факты. В них вся история бело-красно-белого флага. Как образно сказал один заслуженный белорусский ученый, история, которая уместилась в три года: два года во время гитлеровской оккупации и неполный один — во время кайзеровской. Все россказни о древнем и средневековом происхождении бело-красно-белого флага оказались хорошо спланированной и подготовленной ложью. Лопнули, как мыльный пузырь, небылицы о "боевом бело-красно-белом стяге кривичских дружин", о присутствии этого "стяга" на поле Грюнвальдской битвы, в Оршанской битве 1514 года, в отрядах К.Калиновского и т.п. Исторические документы свидетельствуют, что среди 40 знамен, под которыми выступали полки Великого княжества Литовского в Грюнвальдской битве, не было, да и не могло быть ни одного бело-красно-белого.

По многочисленным публикациям, дискуссиям за "круглым столом" и т.п. историки так и не смогли найти документальные свидетельства в пользу того, что хотя бы одно общенациональное событие до XX века проходило под сенью бело-красно-белого флага. И это неоспоримый факт.

Не прошел трюк у фальсификаторов истории и со средневековой (?) картиной "Битва под Оршей", на которой они увидели "боевые белорусские бело-красно-белые стяги... в белых с тонкими красными крестами на треугольных вымпелах на копьях воинов", которые, став жертвой своих же вымыслов, сами и объяснили: "кресты разной формы и цвета на полотнище в христианской традиции имеют свое значение" ("Советская Белоруссия", 12.10.89 г., "Неман", 1991 г., №5).

А ведь именно этот "источник" имел в виду бывший президент АН БССР В.П.Платонов, ныне живущий в США, когда, сознательно дезинформируя депутатов Верховного Совета, говорил им на сессии, что бело-красно-белый флаг известен с 1514 года, "а может, и раньше". "Флаг этот — глубокая история", — лживо убеждал президент академии депутатов. И, как показало голосование, сумел обмануть, хотя никаких оснований для этого не имел, как и все другие, выступившие 19 сентября 1991 года в поддержку штандарта.

В заключение приведу слова известного белорусского ученого члена-корреспондента АН Беларуси А.И.Журавского: "Ніякія гістарычныя крыніцы не змяшчаюць сведчанняў аб існаванні калісьці ў беларусаў нацыянальнага бела-чырвона-белага сцяга... Аднак яго ўвядзенне суправаджаецца цяпер разнастайнымі спекуляцыйнымі аргументамі, разлічанымі на недасведчанасць беларусаў у сваёй гісторыі" (Навіны Беларускай акадэміі, 3.07.92 г., №26).

Листовка из почтового ящика

Еще раз о флаге

Валентин КОРЗУН,
ст. научный сотрудник АН Беларуси

Не стихают страсти по поводу ставшего державным бело-красно-белого флага. Но большинство населения Беларуси, оказывается, почти ничего не знает о его происхождении и истории. А суть дела такова.

В марте 1918 года в оккупированном кайзеровскими войсками Минске была провозглашена так называемая Белорусская Народная Республика (БНР). Вскоре эта "республика" приняла свой флаг. С одной стороны его было бело-красно-белое трехполосье, а с другой — знак "Погоня" в лучах солнца.

Официального утверждения образца флага не было. Из-за технических затруднений с изображением на одной из его сторон всадника с мечом допускалась замена этого рисунка надписью: "Няхай жыве вольная Беларусь!" Вот это и есть первое в истории явление на нашей земле трехполосного бело-красно-белого флага.

С изгнанием немецких, а затем и польских оккупантов Рада несостоявшейся БНР вместе с изобретенным ею флагом оказалась за рубежом (продержалась до 15 октября 1925 г.).

В 1941 году деятели, не пожелавшие порвать с идеей БНР и сомкнувшиеся с германским фашизмом, пришли на территорию Белоруссии вместе с оккупационными войсками вермахта, создали свои "управы", а затем, по указанию оккупантов, и "правительство" — так называемую Белорусскую центральную раду. Притащили они с собой и флаг — трехполосный бело-красно-белый, но уже с обеих сторон. Изображение "Погони" в лучах солнца на одной из сторон флага исчезло. Этим штандарт белорусских гитлеровцев отличался от флага, принятого деятелями БНР в 1918 году.

Бело-красно-белый с обеих сторон флаг и был утвержден в качестве национального для белорусов генеральным комиссаром оккупированной Белоруссии Вильгельмом Кубэ 27 июля 1942 года. Под этим флагом рота полицаев под командованием И.Мелешко учинила резню в Хатыни.

А сегодня ветер треплет его над Домом правительства Республики Беларусь. Так что жители Белоруссии, называющие новый флаг над городом фашистским, вполне правы.

И случайно ли, что "Дзень незалежнасці" нас заставили праздновать именно 27 июля?!

Будзем аб'ектыўнымі!

Гістарычная праўда не на баку В.Корзуна і В.Сарокіна

Аляксей ЛІТВІН,
загадчык аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі

В.Корзун (як і В.Сарокін. — **Рэд.**) ставіць пад сумненне даўняе гістарычнае паходжанне Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Ён сцвярджае, што першае з'яўленне бел-чырвона-белага сцяга на Беларусі звязана з утварэннем БНР ва ўмовах нямецкай акупацыі 1918 года: "В марте 1918 года в оккупированном кайзеровскими войсками Минске была провозглашена так называемая Белорусская Народная Республика (БНР). Вскоре эта "республика" приняла свой флаг. С одной стороны его было бело-красно-белое трехполосье, а с другой — знак "Погоня" в лучах солнца... Вот это и есть первое в истории появление на нашей земле трехполосного бело-красно-белого флага".

Аднак гэта не адпавядае гістарычнай праўдзе. Як вядома, вексілалогія (навука аб дзяржаўных сімвалах, або сцягазнаўства) адрознівае дзяржаўную, афіцыйна ўзаконеную і нацыянальную сімволіку.

Нацыянальную сімволіку нельга адмяніць якім-небудзь юрыдычным актам, бо яна існуе аб'ектыўна. Як пісаў сцягазнаўца К.Іваноў: "Спрадвеку склалася гама любімых народам, найбольш распаўсюджаных у народзе колераў. Палотнішчы нацыянальных колераў прынята называць Нацыянальнымі сцягамі" ("Звязда", 11 верасня 1991 г.).

У прэсе было шмат публікацый, дзе падрабязна **прасочваўся радавод беларускіх нацыянальных сімвалаў ад далёкай старажытнасці,** пераканаўча паказвалася, што белы і чырвоны колеры спрадвеку былі любімымі колерамі нашых продкаў.

Гербам і сцягам Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) — супольнай дзяржавы беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў была белая (срэбная) выява конніка з узнятым мячом ("Пагоня") на чырвоным палотнішчы або шчыце. Гама старажытнага герба адлюстроўвае архаічную знакавую сістэму колераў, якія адпавядаюць традыцыям народа.

Пра паходжанне "Пагоні" грунтоўна пісалі Г.Штыхаў, А.Цітоў, А.Грыцкевіч, М.Ткачоў. Паходжанню нацыянальнага, бел-чырвона-белага сцяга прысвечаны артыкулы В.Вячоркі: ("Неман", 1991, №5, "Звязда", 1991, 11 верасня); С.Рудовіча ("Звязда", 1992, 25 сакавіка). А.Цітоў у кніжцы "Наш сімвал — Пагоня" адзначае, што ў 1781 годзе ў Віцебску быў зацверджаны гарадскі герб з выявай Пагоні **на паласатым чырвона-белым полі.**

У Віленскім гісторыка-этнаграфічным музеі знаходзіцца трохкутны сцяжок часоў паўстання К.Каліноўскага (1863—1864 гг.), на якім у **сярэдзіне белага поля маецца чырвоная паласа.** Больш таго, у Варшаўскім нацыянальным музеі захоўваецца карціна "Бітва пад Воршай. 1514 год", якая створана, як мяркуюць даследчыкі, удзельнікам ці сучаснікам бітвы. На карціне кожны рыцар (беларускі) трымае кап'ё (дзіду), на канцы якога **доўгі белы сцяжок з паземнаю чырвонаю паласой пасярэдзіне і вертыкальнай бліжэй** да дрэўка.

За караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазу афіцыйна ўздымалі чырвона-бела-чырвоны сцяг, а за Уладзіслава IV — чырвона-бела-чырвона-белы (XVII стагоддзе). Такая расфарбоўка вынікала з колераў дзяржаўных гербаў Кароны Польскай і ВКЛ: белы (срэбны) польскі арол і белая (срэбная) Пагоня на чырвоных шчытах.

Пераемнасць гістарычных традыцый па выкарыстанню нацыянальных сімвалаў знайшла сваё адлюстраванне ў спробах самавыяўлення ў сімволіцы беларускага нацыянальнага Адраджэння пачатку XX стагоддзя.

За вясну—лета 1917 года нацыянальныя колеры — белы і чырвоны — зноў занялі трывалае месца ў беларускай палітычнай свядомасці. Аб гэтым сведчаць наступныя факты:

1. У сакавіку 1917 г. у Петраградзе над будынкам Беларускага таварыства дапамогі пацярпеўшым ад вайны лунаў беларускі сцяг ("Звязда", 25 сакавіка 1992 г.).

2. 12 сакавіка 1917 года ў Мінску адбыўся Дзень беларускага значка, на якім прадавалі значкі з відарысам бела-чырвона-белага сцяга ("Мінская газета", 1917 г., 13 сакавіка).

3. Вайскоўцы-беларусы насілі бела-чырвона-белыя стужкі, выконваючы рашэнне Рады беларускіх культурна-асветніцкіх гурткоў у войску ад 5 жніўня 1917 года (Турук Ф. Белорусское движение. М., 1921, с. 91).

4. Грунтуючыся на архіўных матэрыялах (аўтабіяграфія К.Дуж-Душэўскага, якая знаходзіцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве, Музеі літаратуры і мастацтва Беларусі), навуковы рэдактар выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" Станіслаў Рудовіч робіць вывад аб тым, што эскіз бел-чырвона-белага сцяга быў створаны К.Душэўскім не пазней пачатку 1917 года ("Звязда", 25 сакавіка 1992 г.).

Такім чынам, з вышэйпрыведзеных фактаў можна зрабіць вывад аб тым, што сцвярджэнне В.Корзуна пра першае з'яўленне бел-чырвона-белага сцяга на нашай зямлі ў час нямецкай акупацыі 1918 года і стварэнне БНР не адпавядае сапраўднасці. Тым больш, у часопісе "Варта" за 1918 год змешчаны здымак, прысвечаны першым дням стварэння і дзейнасці беларускага ўрада — Народнага Сакратарыяту — 19—21 лютага 1918 года. На прыведзеным здымку мы бачым былы дом губернатара, упрыгожаны беларускімі нацыянальнымі бел-чырвона-белымі сцягамі. Менавіта беларускі нацыянальны сцяг быў зняты немцамі 25 лютага 1918 года з сядзібы Народнага Сакратарыяту — дома губернатара.

Не адпавядае сапраўднасці сцвярджэнне В.Корзуна аб тым, што Рада БНР "продержалась до 15 октября 1925 года". 15 кастрычніка 1925 года Рада БНР поўнасцю не спыніла сваёй дзейнасці. Была скасавана толькі Рада народных міністраў, якую ўзначальваў А.І.Цвікевіч. Частка членаў Рады на чале са старшынёй П.Крэчэўскім не пагадзілася з рашэннямі Берлінскай канферэнцыі і працягвала сваю дзейнасць у Празе. П.Крэчэўскі быў абраны прэзідэнтам Рады БНР. Пасля яго смерці (1928 г.) абавязкі прэзідэнта Рады выконваў яго намеснік В.Захарка (памёр у 1943 г.).

Фармальна Рада БНР дзейнічае і сёння. Яе прэзідэнт Я.Сажыч удзельнічаў 25 сакавіка 1993 г. у святкаванні 75-годдзя абвяшчэння Незалежнасці БНР у Мінску.

Не адпавядае гістарычнай праўдзе сцвярджэнне аўтараў лістовак, што Хатынь спалілі "полицаи роты Ивана Мелешко под бело-красно-белым флагом, который развевается сейчас над Домом правительства".

Па-першае. Хатынь была знішчана галаварэзамі батальёна спецпрызначэння СС, якім камандаваў немец О.Дзірлівангер і паліцэйскімі 118-га украінскага паліцэйскага батальёна. Першы быў тыповы нямецкі эсэсаўскі батальён, у склад якога ўваходзілі немцы і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей былога Савецкага Саюза.

118-ы батальён быў створаны ў 1942 годзе пад Кіевам у асноўным з дабравольцаў і ваеннапалонных украінцаў.

Па-другое. Сапраўды, летам 1942 г., па патрабаванню беларускіх нацыянальных дзеячаў, Беларускай Народнай Самапомачы, В.Кубэ афіцыйна **дазволіў выкарыстоўваць** у Генеральным камісарыяце Беларусі нацыянальныя знакі і эмблемы, а не зацвердзіў. У дакуменце, падпісаным В.Кубэ 27 ліпеня 1942 г., гаворыцца:

